www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта

22 лютага 2008 года, № 3 (1975)

ПАДЗЕЯ

## АДУКАЦЫЯ – ПРЫЯРЫТЭТНЫ НАПРАМАК САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАГА РАЗВІЦЦЯ БЕЛАРУСІ



Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка.

***Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка наведаў 12 лютага новы вучэбны корпус Белдзяржуніверсітэта на Кальварыйскай, 9, дзе месцяцца факультэт журналістыкі і факультэт філасофіі і сацыяльных навук. У мінулым нумары газеты мы падрабязна пісалі, што ўяўляе сабою гэты прыгожы будынак, аснашчаны самым сучасным абсталяваннем. Аб тым, як ішло будаўніцтва, а таксама пра бліжэйшыя планы універсітэта кіраўніку дзяржавы зрабіў справаздачу рэктар БДУ прафесар Васіль Стражаў.***



Студэнты БДУ задаюць пытанні кіраўніку дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка завітаў у аўдыторыі, пазнаёміўся з кнігавыдавецкай прадукцыяй БДУ, агледзеў тэлестудыю, на базе якой будучыя тэлежурналісты змогуць не толькі набірацца практычнага досведу, але і рабіць уласны інфармацыйны прадукт высокай якасці.

Убачанае заслужыла добрую ацэнку Прэзідэнта. Менавіта з гэтага ён і пачаў сваё выступленне перад студэнтамі і выкладчыкамі ў актавай зале. Дарэчы, слухалі кіраўніка дзяржавы і ў іншых аўдыторыях БДУ, куды вялася прамая трансляцыя па кампутарнай сетцы. Прамова лідара краіны была прысвечана месцу Беларусі ў сучасным свеце. Нагадаем, што 5 гадоў таму Аляксандр Лукашэнка выступаў у нашым універсітэце на тэму "Гістарычны выбар Беларусі", таму гэтую прамову можна лічыць працягам дыялога.

Прэзідэнт адзначыў, што пасля яго апошняга наведвання БДУ тут многае змянілася да лепшага. Пабудаваны вучэбна-гасцінічны комплекс, корпус для будучых юрыстаў і новы будынак для згаданых факультэтаў. "Мне прыемна было пачуць, што час грандыёзнай новабудоўлі ў БДУ заканчваецца, а вось мадэрнізацыя і капітальны рамонт таго, што ёсць, будзе працягнуты. Менавіта не пачаты, а працягнуты", – падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Па яго словах, гэты перыяд быў часам няпростых пераўтварэнняў як у краіне, так і ў БДУ. І вельмі важна, што універсітэту ўдалося вярнуць статус галоўнай ВНУ, вядучага навучальнага і навуковага цэнтра краіны, замацаваць сваё асноўнае багацце – кваліфікаваны выкладчыцкі корпус і найвышэйшы ўзровень адукацыі. "Дзяржава зацікаўлена ў тым, каб марка і прэстыж БДУ з годнасцю падтрымліваліся як у Беларусі, так і за яе межамі, каб на гэтую ВНУ раўняліся і іншыя навучальныя ўстановы", – сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт зазначыў, што адукацыя застаецца прыярытэтным кірункам сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі. Толькі сёлета ў гэтую сферу будзе ўкладзена пятая частка сродкаў кансалідаванага бюджэту Беларусі. За апошнія гады ў рэспубліцы створаны два новыя рэгіянальныя універсітэты, уведзены ў эксплуатацыю 10 аб'ектаў для вышэйшых навучальных устаноў на суму болей за 200 млрд руб. Штогод павышаюцца ўсе віды стыпендый; пачынаючы з 2008 г., значна павялічаны даплаты выкладчыкам і навуковым супрацоўнікам за вучоныя ступені і званні.

Прэзідэнт запэўніў, што ў бліжэйшыя гады ў беларускіх ВНУ будуць пабудаваныя новыя вучэбныя карпусы і інтэрнаты больш чым на 14 тыс. месцаў. На гэтыя мэты выдаткавана 900 млрд руб.

"Айчынная вышэйшая школа – гэта прадмет нашага законнага гонару. У Беларусі на 10 тыс. насельніцтва прыходзіцца 425 студэнтаў. Гэта адзін з найвышэйшых паказальнікаў сярод еўрапейскіх дзяржаў. Пацвярджае канкурэнтаздольнасць айчыннай вышэйшай адукацыі і тое, што сёння ў нашых установах навучаецца больш за 5 тыс. замежнікаў. І іх будзе яшчэ болей", – упэўнены Прэзідэнт.

На думку Аляксандра Лукашэнкі, капіталаўкладанні ў развіццё адукацыі, падрыхтоўку кваліфікаваных спецыялістаў – гэта самыя надзейныя і правільныя інвестыцыі ў перспектыву нашай маладой дзяржавы.

Гаворачы пра беларускую знешнюю палітыку, кіраўнік дзяржавы яшчэ раз нагадаў яе "залатое правіла": шматвектарнасць і зацікаўленасць ва ўзаемакарысных кантактах. Беларусь, паводле яго слоў, ні ад каго не адгароджваецца жалезнай заслонай. "Наадварот, мы актыўна імкнёмся да супрацоўніцтва з усімі дзяржавамі. І ў першую чаргу з такімі гігантамі, як Расія, Кітай, краіны Азіі, Лацінскай Амерыкі, Афрыкі. Адначасова Беларусь мае інтарэсы і ў Еўропе – больш за 40 % беларускага экспарту прыпадае на краіны ЕС", – заўважыў Прэзідэнт. Адметна тое, што ў завяршальнай стадыі знаходзяцца перамовы аб стварэнні ў Беларусі прадстаўніцтва Еўрапейскай камісіі, з чым Аляксандр Лукашэнка звязвае асаблівыя надзеі ў развіцці плённага партнёрства з Еўропай.

У гаворцы пра самыя значныя рашэнні падчас прэзідэнства лідар краіны назваў выхад у космас і будаўніцтва беларускай АЭС. Гэтыя падзеі, як ён лічыць, стануць добрым імпульсам для далейшага інтэлектуальнага развіцця нашай дзяржавы. Нягледзячы на няўдалы запуск першага айчыннага спадарожніка, Аляксандр Лукашэнка заверыў ў хуткім стварэнні новага касмічнага апарата, яшчэ больш сучаснага, з унікальным абсталяваннем. Паводле яго слоў, у Беларусі ўжо ствараецца неабходная інфраструктура і Цэнтр кіравання палётамі. На парадку дня стаіць пытанне аб уключэнні нашай краіны ў сістэму касмічных праграм Расіі. На думку Прэзідэнта Беларусі, у БДУ ёсць усе ўмовы для падрыхтоўкі адпаведных спецыялістаў. "Выхад у космас і стварэнне ўласнай АЭС – гэта не шэраговыя рэчы. Каб стаць касмічнай дзяржавай, патрэбны "інтэлектуальны скачок". Для падрыхтоўкі людзей да працы на нашай АЭС мы практычна ствараем асобны накірунак не толькі ў навуцы, але і ў адукацыі. Аднак затым мы можам "прадаваць" свае ўменні, веды, зарабляючы такім чынам грошы для краіны. Менавіта таму мы сёння накіроўваем сродкі на развіццё найноўшых тэхналогій", – дадаў Аляксандр Лукашэнка.



Аляксандр Лукашэнка ў вучэбнай аўдыторыі новага корпуса факультэта журналістыкі падчас заняткаў прафесара Ніны Фральцовай.

Прэзідэнт закрануў і пытанні, якія актыўна абмяркоўваюцца ў грамадстве і ў СМІ, у тым ліку ўпарадкаванне сацыяльных ільгот для насельніцтва: "Паверце, у ніводнай краіне няма такога аб'ёму і маштабу льгот і прэферэнцый, якія былі ў нас да апошняга часу. Далей такую нагрузку ўскладаць на эканоміку было не магчыма. Тут важна было захаваць прынцып сацыяльнай справядлівасці, каб сродкі з бюджэту паступалі да тых, хто ў іх мае найбольшую патрэбу. Таму мэтай зробленых захадаў стала адмова ад масавых, агульных сацыяльных ільгот і ўкараненне механізма адраснай дапамогі". Кіраўнік дзяржавы зазначыў, што вызваленыя сродкі накіроўваюцца на рашэнне першачарговых сацыяльных задач: падтрымка шматдзетных сем'яў, фінансаванне праграмы "Дзеці Беларусі", істотнае павелічэнне грашовай дапамогі на дзяцей, значнае пашырэнне аб'ёмаў жыллёвых крэдытаў, частковае пагашэнне запазычанасці па іх. Разам з тым, падкрэсліў ён, будзе весціся пастаянны маніторынг усіх працэсаў упарадкавання льгот, аналіз работы дзяржаўных органаў, які пакажа, дзе трэба ўнесці карэктоўку, каб сістэма працавала эфектыўна.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што галоўным прыярытэтам дзяржавы з'яўляецца гарманічнае развіццё чалавека, фарміраванне эфектыўных сістэм аховы здароўя, адукацыі, развіцця навукі, інавацыйнай дзейнасці.

Ён нагадаў, што 2006 год быў у краіне Годам маці, 2007-мы – Годам дзіцяці. Пільная ўвага дзяржавы да сям'і і дзяцей, узмацненне дзяржаўнай падтрымкі далі свой плён. Толькі ў студзені–лістападзе 2007 г. колькасць народжаных узрасла амаль на 8 % у параўнанні з мінулым годам. Цяперашні год аб'яўлены Годам здароўя, які, па словах беларускага лідара, стане часам ажыццяўлення шэрагу важных спраў агульнанацыянальнага маштабу. Будзе праведзеная поўная дыспансерызацыя насельніцтва краіны і агульнанацыянальная прапаганда здаровага ладу жыцця, разгарнецца мэтанакіраваная работа па далучэнні грамадзян да рэгулярных заняткаў фізкультурай. Словам, асаблівай рысай гэтага года стане мода на здароўе, фізічную дасканаласць і маральную прыгажосць. Аляксандр Лукашэнка заклікаў студэнтаў адзначыць Год здароўя адмовай ад усіх шкодных звычак.

У звароце да будучых журналістаў Прэзідэнт заявіў: "У руках сродкаў масавай інфармацыі – зброя самай разбуральнай моцы, і таму яны павінны кантралявацца дзяржавай. У Беларусі найбуйнейшыя СМІ, як і ўся ідэалогія, не прыватызуюцца. Усё павінна быць у інтарэсах дзяржавы. Паралельна з ростам аўтарытэту і ўплыву СМІ ўзрастае і іх адказнасць перад грамадствам за праўдзівасць інфармацыі". Прэзідэнт пажадаў моладзі: "Калі хочаце жыць і гадаваць сваіх дзяцей у спакойным грамадстве, то ўласнымі рукамі будуйце сваю дзяржаву. Парадак у краіне – гэта наш імідж, наш здабытак".

Пасля выступлення Аляксандр Лукашэнка адказаў на пытанні студэнцкай аўдыторыі. Іх было каля 30, у тым ліку асабістага характару.

**Падрыхтаваў**
**Сяргей ШАФАЛОВІЧ**
**Фота БелТА**

УНІВЕРСІТЭТ



# ПРА НЕКАТОРЫЯ ПЫТАННІ ПРЫМЯНЕННЯ НОВЫХ ФОРМАЎ ЗАКАНАДАЎСТВА АБ АДПАЧЫНКАХ



Рэктарат і ўпраўленне кадраў інфармуе работнікаў комплекса Беларускага дзяржаўнага універсітэта, што з 26 студзеня 2008 г. пачаў дзейнічаць **абноўлены Працоўны кодэкс (ПК) Рэспублікі Беларусь**, у якім адпаведна Закону "Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Працоўны кодэкс Рэспублікі Беларусь" ад 20.07.2007 № 272-З прадугледжаны шэраг нормаў, што тычацца рэалізацыі права работніка на адпачынак.

Паводле арт. 150 ПК РБ работнікам дажоцца наступныя віды адпачынкаў:

1) працоўныя адпачынкі: асноўны адпачынак і дадатковыя адпачынкі;

2) сацыяльныя адпачынкі: па цяжарнасці і родах, па догляду за дзецьмі, у сувязі з навучаннем, творчыя, у сувязі з аварыяй на Чарнобыльскай АЭС, па ўважлівых прычынах асабістага і сямейнага характару.

Як відаць, з ПК, што дзейнічае сёння, выключаны паняткі "асноўны мінімальны адпачынак", "асноўны падоўжаны адпачынак". Наўзамен ім Законам прадугледжана атрыманне ўсімі работнікамі асноўнага адпачынку працягласцю 24 каляндарныя дні, што на 3 дні перавышае працягласць асноўнага мінімальнага адпачынку. Працягласць асноўнага адпачынку не можа быць меней за 24 каляндарныя дні і абавязковая для ўсіх наймальнікаў.

Дзеючы арт. 158 ПК прадугледжвае, што дадатковы адпачынак за ненармаваны працоўны дзень будзе давацца за працу звыш нармальнай працягласці працоўнага часу.

З улікам новых палажэнняў арт. 158 ПК дапоўнены арт. 118[1], які вызначае панятак ненармаванага працоўнага дня.

Ненармаваны працоўны дзень – асаблівы рэжым працы, у адпаведнасці з якім асобныя работнікі могуць пры неабходнасці эпізадычна па пісьмовым ці вусным загадзе (распараджэнні), пастанове наймальніка ці па сваёй ініцыятыве з ведама наймальніка ці ўпаўнаважанай службовай асобы наймальніка выконваць свае працоўныя абавязкі па-за межамі ўстаноўленай нормы працягласці працоўнага часу. Магчымая ў сувязі з гэтым перапрацоўка звыш нормы працоўнага часу не з'яўляецца звышурочнай работай і кампенсуецца атрыманнем дадатковага адпачынку за ненармаваны працоўны дзень.

Раней дадатковы адпачынак за ненармаваны працоўны дзень прадстаўляўся паводле Пераліку работнікаў з ненармаваным працоўным днём, зацверджаных рэспубліканскімі органамі дзяржкіравання (галіновымі міністэрствамі і дзяржаўнымі камітэтамі). У галіновыя пералікі работнікаў з ненармаваным працоўным днём, у тым ліку і работнікаў адукацыі, былі ўключаны амаль усе катэгорыі кіраўнікоў, спецыялістаў і службоўцаў. Прычым на практыцы гэтыя работнікі не заўсёды працуюць ва ўмовах ненармаванага дня.

Новая рэдакцыя арт. 156 ПК прадугледжвае атрыманне дадатковага адпачынку за ненармаваны працоўны дзень за кошт уласных сродкаў наймальніка працягласцю 7 каляндарных дзён.

Дадзеная норма будзе садзейнічаць змяненню падыходаў у прадастаўленні ўказанага адпачынку. Будуць улічваца як фактычная перапрацоўка нормы працягласці працоўнага часу, так і сама неабходнасць выканання работнікам абавязкаў за межамі ўстаноўленай нормы працоўнага часу.

Працягласць працоўнага часу работнікаў з ненармаваным працоўным днём не можа быць меншай за тую, што ўстаноўлена заканадаўствам, то-бок 40 гадзін (арт. 112 ПК). Заканадаўствам не ўстаноўлены нормы перапрацоўкі звыш устаноўленага працоўнага часу для ненармаванага працоўнага дня. Разам з тым, такая перапрацоўка не можа быць штодзённай і, адпаведна, ненармаваны працоўны дзень не можа ператварацца ў пастаянна падоўжаны.

Кіраўніцтва БДУ вырашыла пытанне аб дадатковых адпачынках за ненармаваны працоўны дзень асобным катэгорыям кіраўнікоў, спецыялістаў і службоўцаў за кошт уласных сродкаў. У найбліжэйшы час усе зацікаўленыя работнікі БДУ змогуць атрымаць інфармацыю аб дадатковых адпачынках за ненармаваны працоўны дзень ва ўпраўленні кадраў БДУ, у кадравых работнікаў юрыдычных асоб, а таксама на сайце БДУ.

Для асобных катэгорый работнікаў прадугледжана атрыманне асноўнага адпачынку больш за 24 каляндарныя дні. Пералік арганізацый і пасадаў, а таксама катэгорый работнікаў, умовы атрымання і канкрэтная працягласць такіх адпачынкаў для ўстаноў адукацыі вызначаны пастановай Савета Міністраў РБ ад 24.01.2008 № 100.

Згодна з дадзенай пастановай у БДУ і іншых ВНУ асноўны адпачынак працягласцю 56 каляндарных дзён з 26 студзеня 2008 г. будзе давацца прарэктарам па вучэбнай, навуковай, выхаваўчай рабоце, загадчыкам падрыхтоўчых аддзяленняў, дырэктарам (начальнікам, загадчыкам) структурных падраздзяленняў па асноўнай дзейнасці і іх намеснікам па асноўнай дзейнасці, загадчыкам дактарантуры, аспірантуры, дэканам і іх намеснікам, загадчыкам (начальнікам) кафедраў, прафесарам, дацэнтам, старшым выкладчыкам, асістэнтам, выкладчыкам-стажорам, кіраўнікам вытворчай практыкі, начальнікам (загадчыкам) упраўленняў, аддзелаў па выхаваўчай рабоце з моладдзю і іх намеснікам, вучоным сакратарам. Акрамя таго, асноўны адпачынак працягласцю 56 каляндарных дзён ва ўстановах адукацыі (за выключэннем устаноў пазашкольнага выхавання і навучання, устаноў (іх падраздзяленняў), якія забяспечваюць павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўку кадраў) будзе давацца педагогам-псіхолагам, сацыяльным педагогам, педагогам-арганізатарам, старшым майстрам і майстрам вытворчага навучання.

Гэтая ж пастанова прызначае адпачынак асобным катэгорыям работнікаў, у тым ліку кіраўнікам гурткоў, канцэртмайстрам, акампаніятарам і метадыстам, працягласцю 30 каляндарных дзён. Такая ж працягласць працоўнага адпачынку захавалася ў работнікаў, якія прызнаны інвалідамі, і ў работнікаў, якім яшчэ няма 18-ці гадоў.

Унесены змяненні ў падыходы да прадастаўлення дадатковых адпачынкаў за працу ў шкодных і/ці небяспечных умовах. Прынцыповае значэнне мае прапанаваны падыход ад рэгулявання ўказанага віду адпачынку на аснове Спісу вытворчасцяў, цэхаў, прафесій і пасадаў са шкоднымі ўмовамі працы, паводле якога даецца права на скарочаную працягласць працоўнага часу і дадатковы адпачынак (зацверджаны пастановай Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па працы і сацыяльнай абароне насельніцтва ад 29.07.1994 № 89 з далейшымі змяненнямі і дапаўненнямі), да выкарыстання вынікаў атэстацыі працоўных месцаў паводле ўмоў працы. Пры гэтым максімальная працягласць такога адпачынку паменшыцца з 41 да 28 каляндарных дзён. Пэўны парадак будзе дзейнічаць з 1 студзеня 2009 г. Да гэтага часу дадатковы адпачынак за працу ў шкодных умовах работнікі будуць атрымліваць па ранейшых правілах. На працягу 2008 г. будзе праводзіцца атэстацыя працоўных месцаў.

Законам з ПК выключаны творчы адпачынак працягласцю ад 90 да 180 каляндарных дзён з разраду тых, што аплочваюцца. Ён пераведзены ў разрад сацыяльных адпачынкаў без захавання заработнай платы і рэгулюецца арт. 190 ПК. Такі адпачынак можна атрымаць на працягу каляндарнага года працягласцю не больш за 30 каляндарных дзён, калі калектыўнай дамовай ці пагадненнем не прадугледжана іншае. Творчы адпачынак даецца работнікам для работы над дысертацыяй і для напісання падручнікаў.

Згодна з абз. 4 арт. 2 Закона працоўныя адпачынкі (іх часткі), права на якія ўзнікла ў работнікаў, але не было рэалізавана да ўступлення ў моц Закона – да 26 студзеня 2008 г. – даюцца або кампенсуюцца цалкам да 31 снежня 2008 г. у адпаведнасці з заканадаўствам, што дзейнічала да ўступлення ў моц Закона. Адсюль вынікае, што ў выпадку наяўнасці ў работніка нескарыстаных працоўных адпачынкаў за мінулыя гады ён можа да 31 снежня 2008 г. рэалізаваць сваё права на атрыманне працоўнага адпачынку ці па дамоўленасці з наймальнікам замяніць працоўны адпачынак грашовай кампенсацыяй паводле заканадаўства аб працы, якое дзейнічала да 26.01.2008.

Змяніўся і парадак выплаты грашовай кампенсацыі за нескарыстаны працоўны адпачынак. Калі да 26 студзеня 2008 г. работнік меў магчымасць атрымаць грашовую кампенсацыю за нескарыстаны адпачынак за выключэннем 7-мі каляндарных дзён, то з 26 студзеня 2008 г. грашовую кампенсацыю ён можа атрымаць толькі за частку працоўнага адпачынку, якая перавышае 21 каляндарны дзень.

Замена грашовай кампенсацыяй адпачынкаў, якія даюцца авансам, цяжарным жанчынам, работнікам, прызнаным інвалідамі, работнікам, якім не споўнілася 18 гадоў, і работнікам за працу ў зоне радыеактыўнага забруджвання ў выніку аварыі на ЧАЭС, а таксама дадатковых адпачынкаў за працу ў шкодных і/ці небяспечных умовах і за асаблівы характар працы, не дапускаецца.

Абноўлены Працоўны кодэкс Рэспублікі Беларусь – найважнейшы дакумент, што рэгулюе працоўныя адносіны паміж наймальнікамі і работнікамі на бліжэйшую і аддаленую перспектыву. Мае быць вялікая і карпатлівая праца па яго глыбокім вывучэнні і асэнсаванні не толькі кіраўнікамі, але і ўсімі работнікамі комплекса БДУ, спецыялістамі па кадрах. Гэта неабходна для таго, каб працоўныя адносіны паміж наймальнікамі і работнікамі ладзіліся выключна на прававой аснове і палажэнні ПК няўхільна выконваліся.

**Алег КЛІМКОВІЧ,**
**начальнік упраўлення кадраў БДУ**

# КАМПЕНСАЦЫЯ ЗА ПРАЕЗД

***У адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 14 снежня 2007 г. "Аб некаторых захадах дзяржаўнай падтрымкі насельніцтва" рэктарам БДУ зацверджаны парадак аказання матэрыяльнай дапамогі на праезд студэнтам нашага універсітэта з мэтай узмацніць іх сацыяльную абарону.***



Матэрыяльная дапамога на праезд будзе аказвацца не толькі студэнтам, якія навучаюцца на бюджэтнай (з фонду матэрыяльнай дапамогі факультэта), але і на платнай аснове (са сродкаў, атрыманых ад пазабюджэтнай дзейнасці БДУ).

Памер штомесячнага фонду матэрыяльнай дапамогі на праезд "платнікаў" на факультэтах будзе разлічвацца па формуле: 150 % базавай велічыні памнажаная на 0,1 колькасці іншагародніх студэнтаў платнай формы навучання.

Права на кампенсацыю праезду атрымаюць студэнты I і II ступеняў вышэйшай адукацыі дзённай формы навучання, якія не маюць акадэмічнай запазычанасці і дысцыплінарных спагнанняў, актыўна ўдзельнічаюць у грамадскім жыцці універсітэта і ў якіх сярэднедушавы даход на кожнага члена сям'і не перавышае 150 % найбольшай велічыні бюджэту пражытачнага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва за 6 апошніх месяцаў.

Матэрыяльная дапамога аказваецца на праезд:

1) іншагароднім студэнтам – у гарадскім грамадскім транспарце г. Мінска і транспарце міжгародніх зносін;

2) студэнтам, якія пастаянна пражываюць у Мінску – у гарадскім грамадскім транспарце г. Мінска.

Таксама зацверджаны катэгорыі асоб, якія маюць права на першачарговую матэрыяльную дапамогу (інваліды, сіроты, "чарнобыльцы", члены шматдзетных сем'яў, а таксама іншагароднія студэнты, якія маюць патрэбу ў жыллі пры немагчымасці атрымаць месца ў інтэрнаце).

Рашэнні аб аказанні матэрыяльнай дапамогі на праезд будуць прымаць камісіі на факультэтах (установах адукацыі БДУ), у склад якіх увойдуць прадстаўнікі камітэта "БРСМ", студэнцкага прафкама і работнікі факультэта (установы адукацыі БДУ) на чале з кіраўніком падраздзялення.

Для атрымання матэрыяльнай дапамогі на праезд студэнт асабіста павінен падаць сакратару камісіі наступныя дакументы:

1) заяву ўстаноўленай формы (можна ўзяць у намесніка дэкана па выхаваўчай рабоце ці ва УВРМ);

2) даведку аб даходах усіх членаў сям'і (у тым ліку студэнта, які працуе) за 6 месяцаў, што папярэднічалі пачатку семестра (на 1 верасня, на 1 лютага);

3) даведку пра склад сям'і;

4) праязныя дакументы за месяц, які папярэднічаў месяцу звяртання:

- праязны квіток на месяц або дэкаду – для гарадскога грамадскага транспарта г. Мінска;
- праязны квіток на транспарт міжгародніх зносін (на паездкі ў выходныя і святочныя дні, перыяд сесіі).

Даведка аб даходах усіх членаў сям'і і даведка пра склад сям'і дзейнічае на працягу 6-ці месяцаў. Заява і праязныя дакументы падаюцца штомесяц.

Рашэнне аб аказанні матэрыяльнай дапамогі на праезд прымаецца камісіяй штомесяц. Памер кампенсацыі кожнаму студэнту складае 50 % ад кошту ўсіх пададзеных праязных квіткоў у межах сродкаў, выдаткаваных на матэрыяльную дапамогу на праезд, але не больш за 150 % базавай велічыні.

**Павел СКАЛАБАН,**
**начальнік упраўлення выхаваўчай работы з моладдзю**

***10 снежня 2007 г. Пастановай Савета Міністраў Беларусі зацверджана Палажэнне аб размеркаванні выпускнікоў устаноў адукацыі, якія атрымалі прафесійна-тэхнічную, сярэднюю спецыяльную ці вышэйшую адукацыю.***

# РАЗМЕРКАВАННЕ СТАНОВІЦЦА БОЛЬШ ПЭЎНЫМ

Згодна з агульным палажэннем дадзенага дакумента прынцыпова новым з'яўляецца абавязковае размеркаванне для выпускнікоў першай і другой ступеняў адукацыі. Менавіта з гэтага года выпускнікі магістратуры падпадаюць пад размеркаванне і абавязаны адпрацаваць 2 гады па накіраванні.

Таксама новым лічыцца і накіраванне на працу выпускнікоў, якія навучаліся на ўмовах аплаты, з іх згоды на месцы, што засталіся пасля размеркавання выпускнікоў-бюджэтнікаў.

Падрабязна прапісаны механізм размеркавання для замежных грамадзян і асобаў без грамадзянства, а таксама для выпускнікоў-спартоўцаў, уключаных Міністэрствам спорту і турызму ў спісачныя склады нацыянальных і зборных каманд Рэспублікі Беларусь.

У главе аб парадку правядзення размеркавання наноў акрэслены тэрміны правядзення пасяджэнняў камісій. Пашырылася кола прадстаўнікоў, якія могуць прымаць удзел у рабоце камісій.

Прыярытэт на запрашэнне на працу выпускнікоў паводле дадзенага дакумента маюць дзяржаўныя арганізацыі і арганізацыі з доляй дзяржаўнай уласнасці. Агаворана магчымасць размеркавання выпускнікоў па іменных заяўках.

Акрамя гэтага, прынцыпова новым з'яўляецца тое, што першачарговым правам пры размеркаванні карыстаюцца выпускнікі, якія маюць нагрудныя знакі лаўрэатаў спецыяльных фондаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, і тое, што ў прынцыпі рашэння аб накіраванні выпускніка будуць улічвацца пасляхованасць, удзел у навукова-даследчай і грамадскай рабоце, стан здароўя і сямейнае становішча, а таксама рэкамендацыі ўстановы аб найбольш мэтазгодным накіраванні пэўнага выпускніка на працу і яго асабістае жаданне.

У новым Палажэнні дакладна вызначаецца механізм размеркавання выпускнікоў-інвалідаў, выпускнікоў, якія маюць аднаго з бацькоў- (мужа-/жонку-) інвалідаў, а таксама для выпускнікоў, якія маюць процілапаказанні да працы паводле атрыманай спецыяльнасці, для сямейных, цяжарных, тых, хто мае дзяцей ва ўзросце да 3-х гадоў, і г. д.

Дадзенае Палажэнне дае права ўстанове адукацыі вырашаць пытанні перазмеркавання маладых спецыялістаў на працягу 2-х гадоў пасля заканчэння навучання. Гэта зроблена ўпершыню і намнога пашырае правы і магчымасці маладога спецыяліста.

**Вераніка ДАБРАВОЛЬСКАЯ,**
**начальнік студэнцкага аддзела ўпраўлення кадраў**

## ПАСЯДЖЭННЕ ВУЧОНАГА САВЕТА

Пасяджэнне Вучонага савета БДУ пройдзе 25 лютага. З дакладам аб развіцці навукі ў БДУ за 2007 год выступіць прарэктар па навуковай рабоце Уладзімір Панькоў. Пачатак у 10.00.

## ВЕСТКІ З ФАКУЛЬТЭТАЎ

***Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Украіны ў Рэспубліцы Беларусь Ігар Ліхавой 14 лютага пабываў на філалагічным факультэце БДУ, дзе наведаў кабінет украінскай філалогіі.***

# ПАДТРЫМКА З УКРАІНЫ

На філфаку адбылася сустрэча гасцей з рэктарам Белдзяржуніверсітэта прафесарам Васілём Стражавым, дэканам філалагічнага факультэта прафесарам Іванам Роўдам, на якой абмяркоўваліся пытанні супрацоўніцтва з адукацыйнымі і навуковымі ўстановамі Украіны.

Пасол, які працуе ў нашай краіне каля года, упершыню наведаў БДУ, і тое, што ён убачыў, пакінула прыемныя ўражанні. Кабінет украінскай філалогіі функцыянуе з 2005 г. і дзякуючы украінскім дыпламатам добра забяспечаны вучэбнай, навуковай і мастацкай літаратурай. На аддзяленні украінскай філалогіі навучаюцца 11 чалавек, а яшчэ 8 вывучаюць мову нашых паўднёвых суседзяў як дадатковую спецыяльнасць.

Ігар Ліхавой пацвердзіў зацікаўленасць украінскага боку ў развіцці культурных і адукацыйных кантактаў і паабяцаў арганізаваць для нашых студэнтаў моўную і педагагічную практыку ва Украіне, а таксама дапамагчы з размеркаваннем на працу. Дарэчы, украінскі пасол пасадзейнічаў летась у арганізацыі стажыроўкі нашых студэнтаў у Львоўскім дзяржаўным універсітэце.

Таксама Ігар Ліхавой перадаў кабінету украінскай філалогіі капіравальны апарат, DVD-прайгравальнік, спадарожнікавую антэну і графапраектар з пераносным экранам.

**Валянціна КЛЯНІЦКАЯ**

## МАЙСТРОЎНЯ

# У НОВЫМ ФАРМАЦЕ

***Пад гасцінным дахам спартыўна-аздараўленчага комплекса БДУ "Брыганціна" 15–17 лютага сабраліся ўдзельнікі Трэцяга адукацыйнага семінара- практыкума для рэдакцыйных калегій студэнцкіх газет, які носіць назву "Зімовая школа студэнцкай журналістыкі".***



*Рабочую секцыю вядзе намеснік дэкана факультэта журналістыкі Аляксандр Градзюшка.*

На гэты раз статус мерапрыемства вырас да міжнароднага (Першая школа была гарадской, а Другая – рэспубліканскай).

Студэнты з 31-й ВНУ Беларусі, 12-ці расійскіх і 2-х вядучых ВНУ Украіны сабраліся сюды, каб як мага болей даведацца пра тое, што стаіць за словам "журналістыка" і, зразумела, завесці новыя знаёмствы. Думаю, кожны задаволіў свой інтарэс на ўсе сто. Гэтаму паспрыяла зладжаная работа факультэта журналістыкі, а таксама моладзевых арганізацый БДУ, якія аб'ядналі свае намаганні, каб гэтая школа прайшла паспяхова.

"Журналісты-шкаляры" на адукацыйным семінары атрымалі як тэарэтычныя, так і практычныя веды. На пяці агульных секцыях – "Як рабіць навіны?", "Рэцэпты журналісцкай кухні. Дызайн, вёрстка", "Крута ты трапіў на ТБ: вучымся працаваць у кадры, тэхніка тэлерадыёмовы", "Этыка сучаснай журналістыкі", "Мова і стыль моладзевай прэсы" – урокі давалі выкладчыкі журфака. А вось на секцыях па выбары студэнты маглі паўдзельнічаць у рабоце круглых сталоў рэдактараў студэнцкіх газет і лідараў студэнцкіх арганізацый, засвоіць тэхналогію інтэрв'ю з рэдактарам аддзела "Культура" газеты "Звязда" Таццянай Падаляк, далучыцца да трэнінгу Псіхалагічнай службы БДУ "Твар з вокладкі: як раскрыць патэнцыял сваёй асобы", а таксама атрымаць парады ад фатографа Юрыя Іванова (газета "Культура") і паўдзельнічаць у фотамарафоне. А ўвечары другога дня ў самы разгар мерапрыемства сюды завіталі афіцыйныя госці: першы намеснік міністра адукацыі Беларусі Аляксандр Жук, галоўны рэдактар найбуйнешага айчыннага перыядычнага выдання "СБ–Беларусь сегодня" Павел Якубовіч, рэктар БДУ Васіль Стражаў, дэкан факультэта журналістыкі Сяргей Дубовік, а таксама начальнік упраўлення Міністэрства інфармацыі Беларусі Уладзімір Матусевіч, якія бралі ўдзел у прэс-канферэнцыі ў актавай зале, дзе сабраліся ўсе ўдзельнікі школы.

Пасля пачаліся майстар-класы вядомых прадстаўнікоў беларускіх СМІ. Святлана Бароўская (Першы канал), Арташэс Антанян ("Навіны спорту", АНТ), Аляксей Міхальчанка (АНТ), Каця Пытлева (Першы музычны канал), Ганна Гардзеева (радыё "Радиус-FM"), Ірына Юдзіна (газета"Вечерний Минск") вельмі падрабязна і змястоўна на жыццёвых прыкладах і нават з дапамогай нагляднага матэрыялу расказалі пра свой шлях у журналістыку і працоўныя нюансы ў газетах, радыё і тэлебачанні. Гэтая гутарка аказалася настолькі цікавай, што працягнулася пасля вячэры і была "прымусова" згорнутая арганізатарамі толькі апоўначы, бо надышоў час дыскатэкі.



*Конкурсныя нумары газет удзельнікаў "Зімовай школы студэнцкай журналістыкі".*

Акрамя згаданых пазнавальных мерапрыемстваў, на працягу гэтых дзён студэнты атрымалі магчымасць прадэманстраваць свае журналісцкія здольнасці. Папершае, усе ўдзельнікі былі раздзеленыя на 15 рэдакцый, кожная з якіх мусіла выпусціць спецыяльную газету на 8 палос. Па-другое, "газетчыкаў" чакаў шэраг прафесійных выпрабаванняў. Каб праверыць гатоўнасць кожнага ўдзельніка школы да нечаканай сітуацыі былі падрыхтаваныя і "вуткі" – "мітынг" з транспарантамі "Незалежнасць Брыганціне", а таксама чутка пра таямнічы прывід, што разгульваў ноччу па будынку. Усё гэта рабілася для таго, каб высветліць – ці зможа малады журналіст "выхапіць" навіну. Яшчэ для аматараў прыгод была зладжаная ролевая гульня "Таямніца корпуса № 1", якая патрабавала правядзення журналісцкага расследавання.

Тры надзвычай напружаныя і цікавыя дні праляцелі, як імгненне. Па выніках конкурсаў былі ўручаныя ўзнагароды за найлепшую студэнцкую газету, за найлепшую газету, выпушчаную на месцы, і за перамогу ў фотамарафоне. Рэдакцыі студэнцкіх газет атрымалі зборнік артыкулаў "Студэнцкі друк: праблематыка, дызайн, мова і стыль", які падрыхтавалі выкладчыкі факультэта журналістыкі паводле матэрыялаў мінулай школы.

**Алесь АЛЕСІК**

# БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

**Наведванне 12 лютага Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам новага будынка БДУ, дзе месцяцца факультэты журналістыкі і ФФСН, адлюстравана ва ўсіх рэспубліканскіх СМІ і на інтэрнэтсайтах.**

**Стварэнне Цэнтра аэракасмічнай адукацыі на базе факультэта радыёфізікі і электронікі** – "Минск-новости" (01.02).

**Віктарына па універсітэтазнаўстве** – "Папараць-кветка цвіце падчас вучобы" ("Народная газета", 01.02).

**Адкрыццё спецыяльнасці "Вэбжурналістыка" на журфаку БДУ** – "Ежедневник", Интерфакс, БДГ-on line (02.02).

**Пра сонечнае і месяцавае зацьменні па звестках абсерваторыі БДУ** – "У лютым – два зацьменні" ("Звязда", 02.02); " Луна уходит в тень" ("Минский курьер", 02.02).

**Экспазіцыя БДУ на IV Міжнароднай выставе "Тыдзень моды на здароўе"** – "Каб угнацца за модай – сачы за здароўем" ("Настаўніцкая газета", 02.02).

**Наваселле на журфаку** – "Журфак переезжает!" ("Народная газета", 06.02); "Полет к фантазии" ("СБ – Беларусь сегодня",07.02); open.by, Интерфакс (07.02); "Гаўдэамус, журфак!"("Звязда", 09.02); "Прастор для творчества. И знаний" ("Рэспубліка",12.02); "С новосельем, студенты!" ("Минский курьер", 12.02); БелТА (12.02).

**Пра выданне серыі навукова-папулярных кніг "Мыслители XX века" распавядае прафесар БДУ Таццяна Румянцава** – "Наука мыслить" (СБ – Беларусь сегодня",11.02).

**Зімовая школа журналістыкі** – БелТА (15.02); "Брыганціна: тэрмінова ў нумар!" ("Звязда", 15.02); naviny.by (15.02);"Беларусь сегодня" (19.02).

**Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Украіны Ігар Ліхавой наведаў філфак БДУ** – "Минск-новости" (15.02).

**Майстар-клас гасцей са Швейцарыі для студэнтаў-акцёраў студэнцкіх тэатраў** – БелТА (17.02); tut.by (18.02); open.by (18.02).

*Пра гэтыя і іншыя падзеі паведамлялася таксама на беларускіх тэле- і радыёканалах.*

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

## НАВІНЫ СТУДГАРАДКА

### Дзень Святога Валянціна

14 лютага – улюбёнае свята моладзі. Жыхары інтэрната № 6 Студгарадка вырашылі правесці яго разам у сяброўскай кампаніі. Каб час прайшоў весела, студэнты прыдумалі спецыяльную праграму. Вечар пачаўся казкай пра каханне "Звычайны цуд", якую працягнулі конкурсы. Заканчэннем свята закаханых стала дыскатэка.

### Семінар

19 лютага ў канферэнц-зале інтэрната № 2 адбыўся семінар для педагагічных работнікаў інтэрнатаў "Тэхналогіі работы з моладдзю ў сацыякультурнай сферы".

### МАЗ

20 лютага адбылася экскурсія на Мінскі аўтамабільны завод. Студэнты БДУ пазнаёміліся з працэсамі зборкі аўтобусаў і машын ад першых дэталяў да выхаду на канвеер гатовай прадукцыі, а таксама наведалі музей завода, у якім падрабязна пазнаёміліся з гісторыяй развіцця беларускага аўтамабілебудавання.

### Супермен

"Супермена–2008" 27 лютага абяруць сярод удзельнікаў – прадстаўнікоў васьмі інтэрнатаў Студэнцкага гарадка. Чакаецца незабыўнае шоу. Задоўга да конкурсу пачалася сур'ёзная падрыхтоўка. У Цэнтры сучаснага стылю і моды "Universum Models БДУ" Сашы Варламава маладыя людзі будуць вучыцца мастацтву дэфіле. Псіхалагічная служба БДУ правядзе для іх арт-трэнінг, што дазволіць удзельнікам разняволіцца і больш упэўніцца ў сваіх творчых сілах. Маладзёны, якія прэтэндуюць на званне самага годнага сярод прадстаўнікоў моцнай паловы чалавецтва, палепшаць сваю фізічную форму на занятках па аэробіцы. Хто ж ён, самы моцны, разумны і прыгожы – пакажа фінал.

## АБ'ЯВЫ

### БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасадаў:**

ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: вышэйшай матэматыкі і матэматычнай фізікі, квантавай радыёфізікі і оптаэлектронікі, матэматычных метадаў тэорыі кіравання, агульнай матэматыкі і інфарматыкі, батанікі, малекулярная біялогіі, неарганічнай хіміі, высокамалекулярных злучэнняў, эканамічнай тэорыі;

ПРАФЕСАРАЎ КАФЕДРАЎ: тэарэтычнай фізікі, фізікі паўправаднікоў і нанаэлектронікі, дыферэнцыяльных ураўненняў, неарганічнай хіміі, грамадзянскага працэсу і працоўнага права, крымінальнага працэсу і пракурорскага нагляду, крымінальнага права;

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: фізікі цвёрдага цела, лазернай фізікі і спектраскапіі, методыкі выкладання фізікі і інфарматыкі, ядзернай фізікі, інфармацыйнага і праграмна-матэматычнага забеспячэння аўтаматызаваных вытворчасцяў, матэматычнага мадэлявання і аналізу даных, тэорыі імавернасцяў і матэматычнай статыстыкі, тэорыі функцый, лікавых метадаў і праграмавання, фізіялогіі і біяхіміі раслін, фізіялогіі чалавека і жывёл, крымінальнага працэсу і пракурорскага нагляду, грамадзянскага права, канстытуцыйнага права, тэарэтычнай і інстытуцыянальнай эканомікі;

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: методыкі выкладання фізікі і інфарматыкі, англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў, рускай мовы, раманскіх моваў, фізічнага выхавання і спорту;

ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: зарубежнай літаратуры, грамадзянскага права, тэарэтычнай і інстытуцыянальнай эканомікі;

АСІСТЭНТА КАФЕДРЫ радыёфізікі.

**Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.**

**Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5а, упраўленне кадраў; тэл. 209-54-36.**

### НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЯ ЎСТАНОВА "ІНСТЫТУТ ПРЫКЛАДНЫХ ПРАБЛЕМ ІМЯ А.Н. СЕЎЧАНКІ" БДУ

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасадаў:**

СТАРШАГА НАВУКОВАГА СУПРАЦОЎНІКА па спецыяльнасці 05.17.08 "Працэсы і машыны хімічных тэхналогій";

НАВУКОВАГА СУПРАЦОЎНІКА па спецыяльнасці 05.13.11 "Матэматычнае і праграмнае забеспячэнне вылічальных машын, комплексаў і кампутарных сетак";

НАВУКОВАГА СУПРАЦОЎНІКА па спецыяльнасці 05.17.06 "Тэхналогія і перапрацоўка палімераў і кампазітаў".

**Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.**

**Адрас: г. Мінск, вул. Курчатава, 7; тэл. 212-48-43.**

### ДЗЯРЖАЎНЫ ІНСТЫТУТ КІРАВАННЯ І САЦЫЯЛЬНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ БДУ

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасады:**

ДАЦЭНТА КАФЕДРЫ сацыяльнай работы (2).

**Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.**

**Адрас: 220037, г. Мінск, вул. Батанічная, 15, Дзяржаўны інстытут кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ, аддзел кадраў; тэл. 210-01-10.**

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны універсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Газета зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 30 жніўня 2005 года

22 лютага 2008 года
Падпісана да друку 20.02.2008 г.
Зак. 124. Тыраж 2000 экз. Ум. друк. арк. 1.
Надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ"
ЛП № 02330/0056850 ад 30.04.2004.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Сяргей ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Юлія ЛІТВІНАВА
Камп'ютарная вёрстка Аляксандра САЛАМАХІНА
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, праспр. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Бабруйская, 7, п. 411, тэл. 209-53-45,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by